УДК 82-1/-9:808.26.3

А. А. Крыварот, ст. выкладчык; В. К. Мароз, дацэнт

# ПЫТАННІ МУНІЦЫПАЛЬНАГА КІРАВАННЯ (САМАКІРАВАННЯ) У БЕЛАРУСКІХ ЛЕТАПІСАХ

In article are considered belorussian chronicle-chronically ill persons, reflection in them public-political life of the epoch. These questions in one or another measure have found its reflection in belorussian chronicles. The Inhabitants belorussian city together withmagdeburs right got the row a privilege. They were freed from fortress of the work, miscellaneous of the sort of the obligations, customs collection. They were given right of the participation in shaping organ town home rule and court, creation religious brotherhood and associations in shops on profession. Hereunder they protected itself from arbitrariness and bribery on the part of lord and princely deputy. The Chronicle contains the valuable information about real history event. They illustrate the relations between magistrate and inhabitant Mogilyova, Vitebska and the other city.

**Уводзіны.** Традыцыі беларускага гарадскога самакіравання, якія ўзыходзяць да веча – агульнага сходу гараджан, што, у сваю чаргу, вынікала з вядомых яшчэ ад VI ст. племянных сходаў славян, у той ці іншай ступені знайшлі адлюстраванне ў беларускім летапісанні. Летапісныя крыніцы засведчылі важную ролю веча ў палітычным і грамадскім жыцці Полацка, пра што ёсць звесткі ў Хроніцы Быхаўца і Хроніцы Літоўскай і Жамойцкай. З часам у беларускіх гарадах на месца веча прыйшлі прызначаныя князем намеснікі і ваяводы з падпарадкаванымі ім старастамі, кашталянамі і іншымі дзяржаўнымі асобамі, якія выконвалі адміністрацыйна-гаспадарчыя функцыі. На XIV – першую палову XVI стст. прыпадае інтэнсіўны працэс урбанізацыі: крыніцы даюць звесткі пра 530 гарадскіх паселішчаў, 387 з якіх мелі ў ВКЛ статус горада. Найбольш значнымі цэнтрамі з насельніцтвам да 10 тыс. чалавек у XVI ст. былі Берасьце, Віцебск, Магілеў, Менск, Пінск і іншыя гарады.

**Асноўная частка.** Зацікаўленасць у эканамічным росце гарадоў прывяла да неабходнасці стварэння спрыяльных умоў для росту ў іх гандлю і рамёстваў. У XIV–XVI стст. амаль усе беларускія гарады і мястэчкі атрымалі граматы на магдэбурскае права, заснаванае на выбарным самакіраванні ў адміністрацыйнай, судовай і фінансавай дзейнасці. У адпаведнасці з прывілеем горадам кіраваў магістрат, які спалучаў адміністрацыйныя і судовыя функцыі, таму адпаведна складаўся з дзвюх калегій – рады і лавы.

У беларускім летапісанні перыяду ВКЛ, скіраваным пераважна на паказ значных агульнадзяржаўных палітычных спраў, утрымліваюцца толькі ўскосныя паказчыкі, якія сведчаць пра дзейнасць мясцовага самакіравання ў асобных гарадах. У пазнейшым жа так званым гарадскім летапісанні XVII–XIX стст., наадварот, асноўнае месца займае адлюстраванне мясцовай тэматыкі. Так, у Магілёўскай хроніцы (летапісе, напісаным у XVIII ст. у г. Магілёве Т. Р. Суртам і Трубніцкімі) паведамляецца, што ад другой паловы XVI ст. Магілёў ужо меў права самакіравання. Нельга абысці ўвагаю паведамленне пад 1526 г. пра закладку места Магілёва: «Za Zygmunta, kròla polskiego, a w szesciu leciech będącego syna jego Zygmunta Awgusta, miasto Mohylow założyło się, a zamek z włoscią przed kilkaset lat przet tym był» [1, c. 239]. Таксама каштоўнай з'яўляецца спроба Т. Сурты перакладумачыць паходжанне назвы горада: «Według zdania by mojego, tak tłumaczyć te nazwisko: Mohyi low, po słowiansku nazwany, tłumaczy się – mocny, duży, potężny low, zaczym jako tak iest» [1, c. 239]. Пад 1576 г. змешчана інфармацыя пра тое, як у хуткім часе пасля каранацыі Сцяпана Батары (Стэфана Баторыя) з Магілёва былі адпраўлены паслы прасіць надання гораду магдэбурскага права. І кароль «jako łaskawy oyciec przyjowszy, prawem utytułował, I otrzymali, o co prosili. Potym, w roku 1577-m, miasto Mohilow zaczęło się, sądzic prawem maydeburskim, ktòrego i teraz używamy» [1, c. 240].

Жыхары гарадоў з магдэбурскім правам маглі арганізоўвацца ў рамесныя цэхі, якія мелі свой статут, сцяг, харугву. Цэхавыя брацтвы былі абавязаны выконваць усе распараджэнні магістрата, браць удзел у працэсіях свецкіх, рэлігійных і пахавальных. Прывілеі на магдэбурскае права групавалі гараджан (акрамя шляхты) у адзінае саслоўе – мяшчан [2]. За парушэнне законаў мяшчане неслі як калектыўную, так і персанальную адказнасць: караліся штрафамі, пазбаўляліся прывілеяў і інш. У 1699 г. увесь горад меў спагнанне за тое, што аднаго разу «гультаі якіясь» напалі на каралеўскае войска, што стаяла ў Магілёве. З гэтага ці з якіх іншых прычын («czy z iakowey złey rady, czy z iakowego udania, czyli z niestarania, kto się w te czasy miastem opiekiwał – bog to sądzic będzie») вынікла ўскладненне адносін з каралём Аўгустам. Летапісец падкрэслівае: «cięzko było na miasto, czego, boże, nie dopuszczay na nas». Нягледзячы на неаднаразовыя звароты да караля, нічога не ўдалося паправіць, і на мяшчанах застаўся надзвычай цяжкі падатак, якога «перад тым ніколі не бывала»: «ciężki był na miasto, że musieli saxonom z miato sto tysięcy tynffow porcij

wyliczyc gotową summę, oprocz ynnych dla generałow y ynnych oficerow akkomodacij znacznych» [1, с. 250]. Паборцы Стэфан Хутаровіч, Чортак і Увар праяўлялі неміласэрную жорсткасць: той, хто не мог выплаціць накладзенага падатку, патрапляў у няволю: «takowych sadzano na wieżę y pod wieżę do więzenia» [1, с. 250]. Праз усё гэта нямала людзей бедных «do ostatniego ubozstwa pryszło» [1, с. 250].

З пазіцыі закона горад з магдэбурскім правам залежаў толькі ад цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання. Жыхары гарадоў, якія мелі магдэбурскае права, атрымлівалі шэраг перавагаў: вызваляліся ад прыгонных работ, падводнай павіннасці, мытных збораў; набывалі права ўдзелу ў фарміраванні органаў гарадскога самакіравання і суда, стварэння рэлігійных брацтваў і аб’яднання ў цэхі па прафесіях. Тым самым яны засцерагаліся ад самаўпраўства і рабавання з боку феадалаў і княжацкіх намеснікаў. Разам з тым трэба прызнаць, што ахоўныя граматы не заўсёды служылі надзейнай абаронай ад хцівых рабаўнікоў. Магілёўская хроніка дае на гэта шмат фактаў. Вялікі ўціск меў Магілёў ад мечніка Сініцкага, які сілаю спаганяў грошы, выставіўшы перад ратушаю некалькі харугваў. Магістрат, не маючы іншых спосабаў сабраць грошы, мусіў пазычыць пяць тысячаў талераў бітых («museli te pięci tysięcy talarow bitych wziąc na kark mieski») у пана Краеўскага, рэгента кароннага, а другую частку выплаціць асігнацыямі, пусціўшы па мяшчанах аблігацыю. Рэшта сродкаў паводле тых асігнацый пазней таму ж Сініцкаму была сплочана як са скарбу кабацкага, так і з падаткаў у гарадскую казну, спагнаных з мяшчанаў.

Летапіс утрымлівае каштоўныя звесткі пра рэальныя гістарычныя падзеі, якія ілюструюць дачыненні паміж насельнікамі Магілёва і магістратам. У 1610 г. ў Магілёве мелі месца бунты, завадатарамі (pryncypałami) якіх выступалі Іван Харковіч (Jwan Charkowicz), Мікіта Мільковіч (Mikita Milkowicz), Максім Тальбішаў (Maxim Talbicsow), Гаўрыла Івановіч ła (Hawri Jwanowicz), Міхал Чабатар (Michał Czobotarż), Лавор Міхайловіч (Ławor Michayłowicz), Ісай Шчасны (Jsay Szczesny) і інш. Яны выйшлі з падпарадкавання магістрату: не плацілі падаткаў, на радах і сходах падбухторвалі сваіх людзей званіць у асобны звон, перад ратушай учынялі гвалт, рабілі спробы ўзяць прыступам ратушу і магістрат: «Ktorzy to buntownicy z adheręntami swemi magistratowi spreczni byli, podatkow do miasta I wszelkiego posłuszęstwa do magistratu pełnić nie chcieli». У выніку магістрат апынуўся ў вялікай небяспецы і мусіў звярнуцца па дапамогу да самога караля Жыгімонта ІІІ Вазы. І толькі на аснове адмысловага каралеўскага ліста войт Магілёва Яраш Валовіч, земскі падскарбі і пісар Вялікага княства Літоўскага, змог справіцца з бунтаўнікамі: пяцёра з іх былі пакараны смерцю. Важна, што летапісец дае адсылку да канкрэтнага дакумента, у якім можна прачытаць пра пераказаныя падзеі: «O czym, iesli chocesz dostateczniey wiedzieć, czytay dekret pod datą roku 1610-go miesiąca jula 23-go dnia w actach maydeburij mohilowskiey wpisany» [1, с. 240].

У Магілёўскай хроніцы таксама пераказана канфліктная сітуацыя, якая вынікла з-за грошай паміж бурмістрам Янам Карабанкам і горадам (местам). Помсцячыся, той пачаў судзіцца з горадам, справакаваў на ратушу «камісію, інквізіцыю і экзекуцыю». І так справа зацягнулася, аж пакуль у 1736 г. сам Ян Карабанка «wespoł z życiem y dokumętami apellował na tamten swiat».

Прывілеі на магдэбурскае права дазвалялі ставіць у горадзе ратушу, мець магазіны і латкі, загадваць вагамі і мерамі, адкрываць лазні, будаваць млыны, трымаць вінакурні і ладзіць кірмашы. Справы будаўніцтва горада, асобных яго аб’ектаў падрабязна занатоўваліся магілёўскімі летапісцамі. Паведамлена, што ў 1657 г. пачалі мураваць брацкую званіцу, ужо выведзены падмурак якой быў разабраны для мэтаў абароны пад час асады горада царом маскоўскім Аляксеем Міхайлавічам. У 1660 г. была вымуравана і накрыта брама Магілёва, якая называецца Каралеўская. А ў верасні 1679 г. пачалі мураваць ратушу. У 1696 г. распачалі, а ў 1698 г. вывелі Пакроўскую званіцу. З 1703 г. на 1704 г. коштам горада (to wszytko budowano ze skarbu ratusznego mieskiego) узводзіліся абарончыя збудаванні – драўляныя валы з брамамі і баштамі ад гары Гваздоўкі да самага Дняпра. Такія самыя работы вяліся і з другога боку ў Папінцы. Дрэва на тыя валы бралі ў каго выпадзе, але багатым плацілі, а бедных крыўдзілі.

Шмат увагі летапісец надае не толькі апісанню грамадскіх падзеяў, але і розных здарэнняў. У іх ліку паведамленні пра пажары, прыродныя катаклізмы і інш. Так, у 1664 г. прайшоў агонь ад дома Савы Ціхенькіна, выпаліўшы ўсе крамы, «a domow mało co zgorzało» [3, с. 244]. У тым самым годзе зноў пачаўся пажар ад дома недалёка ад ратушы, у выніку чаго згарэла сама ратуша крамы, царква, званіца і нават званы паплавіліся. Здараліся пажары ў 1665, 1667 і іншых гадах.

Для беларускіх гарадоў быў характэрны неаднастайны склад насельніцтва, дзе побач з беларусамі жылі яўрэі, палякі, украінцы, рускія і інш. Так, магілёўскі летапісец паведамляе, што ў чэрвені 1660 г. горад забраў карчму ў яўрэя Лейбы Зушманавіча: «Roku 1679, Junia 24, na swięty Jan, miasto kabak odebrało od zyda Leyby Zuszmanowicza» [3, с. 245]. А пад 1699 г. апавядаецца пра двух братоў Беймана і Леймана, быццам бы немцаў, а на самой справе, летапісец упэўнены, гэта былі яўрэі, якія каралю па-

зычылі некалькі мільёнаў «gotowych pieniędzy». Паводле каралеўскага прывілею яны атрымалі права спаганяць неабходную суму з магілеўскага замка і ўсёй гарадской гаспадаркі, а таксама з іншых гаспадарак, якія заарэндоўвалі па Літве і Жамойці. У памяці магілёўцаў гэтыя асобы пакінулі надзвычай негатыўны след, пра што сведчыць такі запіс летапісца: «Nie zapomni Mogylow y na długo *tey szaranczy*, albo też y w całey Polszcze y W[ielkim] X[ięstwie] Lit[ewski]m gorzey będą wspominac, gorzey nizli tych niemcow, co z podSmolęska szli podczas woyny Szeynowskiey» [3, с. 251].

Магілёўская хроніка Т. Сурты і Трубніцкіх вылучаецца сярод беларускіх хронік шырынёй ахопу гістарычных падзей: аўтары пакінулі сваеназіранні, пераказалі ўспаміны старажылаў, а таксама выкарысталі звесткі з дакументаў Магілёўскага магістрата і цэркваў, уключылі факты з некаторых украінскіх летапісаў [3, с. 224]. Развіццё горада можна назіраць па запісах пяці пакаленняў летапісцаў, якія вялі хроніку ад канца XVII да сярэдзіны XIX ст. Пачынальнікам магілёўскага летапісання з'яўляецца Т. Сурта, які пакінуў такі запіс ва ўступе да свайго летапісу: «Dopisałem tedy tey kroniki moiej roku 1693 m[ie]s[ią]ca maja dnia 29, według starego kalędarza» [1, с. 239]. Прадаўжальнікамі яго справы сталі чатыры пакаленні Трубніцкіх: Юрый Трубніцкі (звесткі за 1701–1746 гг.), яго сын Аляксандр і ўнук Міхал прадоўжылі запісы да 1856 г., а праўнук Іван, апошні ўладальнік рукапісу, зрабіў адзіны запіс ад 17.03.1864 г. пра вялікую навальніцу, што была ў гэты дзень у Магілёве. Шэраг паведамленняў з 80-х гадоў XVIII ст. да 1810 г. напісаны яшчэ кімсьці невядомым.

**Заключэнне.** Гарадскія хронікі разглядаюцца як «каштоўны збор арыгінальных, нярэдка унікальных звестак па гісторыі беларускіх зямель, крыніца пазнання жыцця беларускага горада эпохі барока. У якасці літаратурных помнікаў гістарычныя аповесці дакументальна-мемуарнага характару вылучаюцца жывасцю і дэталёвасцю апавядання, рэдкай для іншых летапісаў набліжанасцю аўтараў да аб'екта напісання» [4, с. 355]. І ў гэтым плане беларускія летапісы-хронікі выступаюць як адлюстраванне грамадска-палітычнага жыцця адпаведнай эпохі.

## Літаратура


1. Полное собрание русских летописей.– М.: Наука, 1975. – Т. 32. – 234 с.

2. Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі / В. Ф. Бацяеў [і інш.]; рэдкал.: В. М. Бялявіна [і інш.]; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. – Мінск, 2002. – 606 с.

3. Улащик, Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания / Н. Н. Улащик. – М.: Наука, 1985. – 261 с.

4. Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1986. – Т. 3. – 751 с.